КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________С.І.Васілец
“21” 04 2020 г.
Рэгістрацыйны № УД-26-05/63 2020 /уч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАДАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН

## Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі па методыцы выкладання грамадазнаўчых дысцыплін (дата зацвярджэння – 04.02.2015 г., рэгістрацыйны № ТД–А538/тып).

**СКЛАДАЛЬНІК:**
А.А. Корзюк, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
С.В. Паноў, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ДУА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
С.В. Зенчанка, загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат палітычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**:
Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

(пратакол № 8 ад 30 студзеня 2020 г.)

Загадчык кафедры А.А.Корзюк

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

(пратакол № 4 ад 21 красавіка 2020 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядаюць

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В. Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П. Сяткоўская

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце

_________________А.В.Макоўчык
“__” ________________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № УД-26-05_________/уч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАДАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі па методыцы выкладання грамадазнаўчых дысцыплін (дата зацвярджэння – 04.02.2015 г., рэгістрацыйны № ТД–А538/тып).

**СКЛАДАЛЬНІК:**
А.А. Корзюк, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
С.В. Паноў, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ДУА "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
С.В. Зенчанка, загадчыка кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат палітычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**:
Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

(пратакол № 8 ад 31 студзеня 2018 г.)

Загадчык кафедры А.А. Корзюк

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 6 ад 15 сакавіка 2018 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядаюць

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В. Вінаградава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасны перыяд якаснага абнаўлення грамадскіх адносін ва ўмовах рэальнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь грамадазнаўчая адукацыя ў агульнаадукацыйных установах павінна фарміраваць грамадзянскую самасвядомасць і адказную сацыяльную пазіцыю вучняў, рыхтаваць іх да рознабаковай канструктыўнай дзейнасці ў дынамічна развіваючымся свеце жыццёвай практыкі. У рашэнні гэтай задачы і падрыхтоўцы спецыялістаў адпаведнага профілю важную ролю адыгрывае вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін”.

Вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін” забяспечвае падрыхтоўку кваліфікаванага выкладчыка, які валодае філасофскай культурай, ведамі ў шырокім спектры грамадскіх навук, умее вызначаць найбольш эфектыўныя метады, формы і сродкі навучання, садзейнічае развіццю ўменняў і навыкаў творчага мыслення, культуры зносін і вядзення дыскусіі, сувязі тэарэтычных ведаў вучняў з іх жыццёвым вопытам і практычнай дзейнасцю.

Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін непасрэдным чынам звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Педагогіка”, “Псіхалогія”, “Філасофія”, “Паліталогія”, “Гісторыя Беларусі” і інш. Таму вялікае значэнне ў авалоданні ведамі па методыцы выкладання грамадазнаўчых дысцыплін мае ажыццяўленне міждысцыплінарнага падыходу, які дазваляе інтэграваць і сістэматызаваць веды студэнтаў па шэрагу раней засвоеных вучэбных дысцыплінах.

Мэта вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін” – забяспечыць авалоданне тэарэтычнымі асновамі сучаснай методыкі выкладання вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства” і стварыць умовы  для авалодання прафесійнымі кампетэнцыямі, неабходнымі будучым настаўнікам для арганізацыі эфектыўнага навучання прадмету ў сярэдняй школе.

Дадзеная мэта вырашаецца праз рэалізацыю наступных задач:

- засваенне студэнтамі ведаў аб нарматыўным прававым і навукова-метадычным забеспячэнні вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”, яго структуры і змесце асноўных раздзелаў у 9–11 класах сярэдняй школы;
- выяўленне навучальнага, развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства” і вызначэнне аптымальных метадычных шляхоў яго рэалізацыі;

- вызначэнне найбольш эфектыўных метадаў, сродкаў, арганізацыйных форм навучання прадмету і авалоданне прыёмамі іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

1. Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый:

Студэнт павінен:

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

- АК-2. Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання.

- АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

- АК-4. Умець працаваць самастойна.

- АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

- АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

- АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, упраўленнем інфармацыяй і працай з кампутарам.

- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

- АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

2. Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый:

Студэнт павінен:

- СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

- СЛК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

- СЛК-6. Умець працаваць у камандзе.

3. Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый:

Студэнт павінен быць здольны:

- ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

- ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

- ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць навучальныя заняткі розных відаў і формаў.

- ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

- ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

- тэарэтыка-метадалагічныя асновы методыкі выкладання грамадазнаўства, мэту і задачы навучання прадмету ў школе;
- навучальныя, развіваючыя і выхаваўчыя магчымасці зместу сучаснай школьнай грамадазнаўчай адукацыі і шляхі іх рэалізацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен умець:

- вызначаць аптымальныя мэты і задачы вывучэння асноўных кампанентаў зместу школьнай грамадазнаўчай адукацыі;
- адбіраць і выкарыстоўваць адэкватныя мэтам, зместу вучэбнага матэрыялу і пазнавальным магчымасцям вучняў метады, прыёмы і сродкі навучання прадмету, розныя формы і тэхналогіі арганізацыі адукацыйнага працэсу;
- выкарыстоўваць метады аналізу перадавога педагагічнага вопыту для ўдасканалення адукацыйнага працэсу і асабістага педагагічнага майстэрства.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен валодаць**:**

- асноўнымі метадамі, прыёмамі, сродкамі, формамі і тэхналогіямі навучання грамадазнаўству;
- крыніцамі канструявання зместу школьнай грамадазнаўчай адукацыі і асаблівасцямі іх рэалізацыі ў працэсе навучання прадмету.

У тэарэтычнай частцы вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны засвоіць веды аб этапах станаўлення грамадазнаўчай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, прааналізаваць мэты, задачы, логіку пабудовы, структуру, асноўныя праблемы, асаблівасці зместу і методыкі выкладання трох раздзелаў прадмета: “Чалавек. Грамадства. Культура”, “Сучаснае грамадства”, “Беларуская дзяржава”. У час семінарскіх заняткаў студэнты павінны прааналізаваць вучэбную праграму па прадмету, вучэбныя дапаможнікі, метадычную літаратуру, наведаць і прааналізаваць урокі выкладчыкаў-практыкаў, навучыцца самастойна распрацоўваць метадычныя апісанні разнастайных форм вучэбных заняткаў па прадмету.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін” па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны адводзіцца 144 г. (3,5 з.а.), з іх аўдыторных 58 г. (30 г. лекцыі, 28 г. семінарскія заняткі). На самастойную працу адводзіцца 50 гадзін.

Бягучая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з навучальным планам па спецыяльнасці ў форме экзамена (5 семестр).

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ

| Назва вучэбнай дысцыпліны | Семестр | Колькасць гадзін вучэбных заняткаў | | | | | | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Форма бягучай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | З іх | | | | | | |
| | | | | лекцыі | практычныя | семінарскія | лабараторныя | КСР | | |
| Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін | 5 | 144 | 58 | 30 | - | 28 | - | - | 50 | экзамен |
| 1. Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін | 5 | | **4** | 4 | - | | - | | 4 | |
| 2. Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства” | 5 | | **6** | 2 | - | 4 | - | | 4 | |
| 3. Урок грамадазнаўства ў сучаснай школе. | 5 | | **12** | 6 | - | 6 | - | | 6 | |
| 3.1. Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаўства ў сярэдняй школе | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 3.2. Формы заняткаў па грамадазнаўчых дысцыплінах ў сярэдняй школе | 5 | | | 2 | - | 2 | - | | 3 | |
| 3.3. Падрыхтоўка настаўніка да выкладання | 5 | | | 2 | - | 4 | - | | 4 | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| грамадазнаўчых дысцыплін | | | | | | | | | | |
| 4. Структура і змест вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства” | 5 | | **18** | 2 | - | 16 | - | | 12 | |
| 4.1. Метадычныя прынцыпы адбору і канструявання зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства” | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 4.2. Змест і методыка выкладання раздзела “Чалавек. Грамадства. Культура” (9 клас) | 5 | | | | - | 4 | - | | 3 | |
| 4.3. Змест і методыка выкладання раздзела “Сучаснае грамадства” (10 клас) | 5 | | | | - | 4 | - | | 3 | |
| 4.4. Змест і методыка выкладання раздзела “Беларуская дзяржава” (11 клас) | 5 | | | | - | 4 | - | | 3 | |
| 4.5. Метадычныя асаблівасці вывучэння светапогляднага зместу прадмета “Грамадазнаўства” | 5 | | | | - | 2 | - | | 2 | |
| 4.6. Рэалізацыя развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу зместу вучэбнага прадмета | 5 | | | | - | 2 | - | | 2 | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| “Грамадазнаўства” | | | | | | | | | | |
| 5. Метады і прыемы навучання грамадазнаўству | 5 | | **18** | 16 | - | 2 | - | | 18 | |
| 5.1. Агульная характарыстыка метадаў навучання | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.2. Славесны метад навучання грамадазнаўству | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.3. Методыка фарміравання паняццяў у працэсе вывучэння грамадазнаўства | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.4. Рэалізацыя міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязяў пры вывучэнні грамадазнаўства | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.5. Візуальныя сродкі ў навучанні грамадазнаўству | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.6. Практычныя метады навучання грамадазнаўству | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.7. Дакументальна-метадычныя комплексы ў вывучэнні грамадазнаўства | | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.8. Праблемнае навучанне ў працэсе выкладання прадмета “Грамадазнаўства” | 5 | | | 2 | - | | - | | 2 | |
| 5.9. Фарміраванне асобасных, метапрадметных і | 5 | | | | - | 2 | - | | 2 | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| прадметных кампетэнцый вучняў пры вывучэнні грамадазнаўства | | | | | | | | | | |
| **Усяго гадзін** | | **144** | **58** | **30** | **-** | **28** | **-** | **-** | **50** | |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін**

**1.1. Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін як педагагічная навука.** Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін. Працэс навучання грамадазнаўству, яго асноўныя кампаненты. Сувязь методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін з іншымі навукамі. Асноўныя метадычныя праблемы і асаблівасці методыкі выкладання грамадазнаўчых вучэбных дысцыплін. Літаратура па методыцы выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.

**1.2. Этапы станаўлення грамадазнаўчай адукацыі ў сярэдняй школе.** Грамадазнаўчыя дысцыпліны ў сярэдніх навучальных установах Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. – 1917 г. Вывучэнне сацыяльна-палітычных дысцыплін ў савецкай школе. Станаўленне і развіцце грамадазнаўчай адукацыі ў сярэдняй школе Рэспублікі Беларусь у 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. Сучасныя праблемы і тэндэнцыі развіцця школьнай грамадазнаўчай адукацыі.

**Тэма 2. Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”**

**2.1. Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.** Структура грамадазнаўчай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь. Мэты і задачы вывучэння прадмета ў 9–11 класах. Неабходнасць вывучэння грамадазнаўчага курса. Яго месца ў сістэме іншых вучэбных прадметаў. Базавы і павышаны ўзроўні вывучэння прадмета.

**2.2. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК) па прадмету “Грамадазнаўства”.** Вучэбная праграма па грамадазнаўству, яе структура, асноўныя кампаненты і логіка пабудовы. Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб выкладанні вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”, іх прызначэнне і асноўны змест. Вучэбныя дапаможнікі для 9–11 класаў, структура і логіка іх пабудовы. Склад ВМК па грамадазнаўству і характарыстыка яго асобных элементаў.

**2.3. Улік і ацэнка ведаў вучняў па грамадазнаўству.** Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў агульнаадукацыйных устаноў па вучэбных прадметах. Дзесяцібальная сістэма ацэньвання і яе функцыі. Узроўні засваення вучэбнага матэрыялу і іх характарыстыка. Віды і

формы кантролю. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце “Грамадазнаўства”. Экзамен па грамадазнаўству за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

**Тэма 3. Урок грамадазнаўства ў сучаснай школе.**

**3.1. Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаўства ў сярэдняй школе.** Урок як цэласная сістэма. Псіхалагічныя, дыдактычныя і метадычныя асновы правядзення сучаснага ўрока. Дыдактычныя, псіхалагічныя, санітарна-гігіенічныя і метадычныя патрабаванні да эфектыўнага ўрока грамадазнаўства.

**3.2. Формы заняткаў па грамадазнаўчых дысцыплінах ў сярэдняй школе.** Урок — асноўная форма вучэбна-выхаваўчай работы. Тыпалогія ўрокаў грамадазнаўства па асноўнай дыдактычнай мэце. Структура ўрокаў розных тыпаў. Суадносіны тэарэтычнага матэрыялу і практычных заданняў на ўроках па грамадазнаўчых дысцыплінах. Формы заняткаў па грамадазнаўству: лекцыі, семінары, канферэнцыі, дыскусіі, дыспуты, практыкумы і інш. Методыка іх арганізацыі і правядзення. Крытэрыі выбару тыпаў урока і форм арганізацыі заняткаў па прадмету “Грамадазнаўства”.

**3.3. Падрыхтоўка настаўніка да выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.** Вывучэнне нарматыўных дакументаў па прадмету. Складанне каляндарна-тэматычнага і паўрочнага планавання. Вызначэнне мэты і задач урока і канструяванне яго зместу. Структурна-функцыянальны аналіз зместу грамадазнаўчага матэрыялу. Навучальныя, развіваючыя і выхаваўчыя задачы ўрока, тэхналогія іх вызначэння і пастаноўкі. Метадычнае абгрунтаванне пастаўленых мэт урока, выбраных метадаў, прыёмаў і сродкаў іх рэалізацыі. Асаблівасці работы настаўніка ў профільным класе. Методыка аналізу і самааналізу ўрока.

**Тэма 4. Структура і змест вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.**

**4.1. Метадычныя прынцыпы адбору і канструявання зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.** Парадак вывучэння раздзелаў прадмета. Практычная накіраванасць грамадазнаўчай адукацыі. Крыніцы канструявання зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”. Прынцыпы адбору і асаблівасці пабудовы зместу вучэбнага прадмета. Варыятыўны кампанент зместу школьнай грамадазнаўчай адукацыі.

**4.2. Змест і методыка выкладання раздзела “Чалавек. Грамадства. Культура” (9 клас).** Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела. Чалавек. Дзейнасць, зносіны, узаемадзеянне. Асоба, грамадства, дзяржава. Чалавек, грамадства,

культура. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

**4.3. Змест і методыка выкладання раздзела “Сучаснае грамадства” (10 клас).** Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела. Сацыяльная сфера грамадства. Эканамічнае жыцце грамадства. Палітыка-прававая сфера жыцця грамадства. Духоўнае жыцце грамадства. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

**4.4. Змест і методыка выкладання раздзела “Беларуская дзяржава” (11 клас).** Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Асноўныя галіны права. Палітыка беларускай дзяржавы. Беларусь у сучасным свеце. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

**4.5. Метадычныя асаблівасці вывучэння светапогляднага зместу прадмета “Грамадазнаўства”.** Вывучэнне асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы. Арганізацыя работы вучняў з дзяржаўнымі прававымі дакументамі. Вывучэнне пытанняў права ва ўстановах адукацыі. Фарміраванне прававой культуры вучняў. Вывучэнне пытанняў рэлігіязнаўства. Фарміраванне ў вучняў талерантнасці, павагі да рэлігійных пачуццяў вернікаў іншых канфесій. Недапушчальнасць трактоўкі рэлігіязнаўчых ведаў у веравызнальным кантэксце. Аб’ектыўнае інфармаванне вучняў аб дзейнасці розных рэлігійных арганізацый, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь.

**4.6. Рэалізацыя развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.** Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з грамадазнаўчым матэрыялам. Шляхі фарміравання гуманістычнага светапогляду вучняў, іх свядомай адказнай жыццёвай пазіцыі ў розных сферах жыцця і дзейнасці, умення жыць у мнагамерных зносінах з іншымі людзьмі і практычна дзейнічаць з усведамленнем агульначалавечых каштоўнасцей на аснове інтэграцыі ведаў па філасофіі, эканамічнай тэорыі, сацыялогіі, псіхалогіі, этыцы, эстэтыцы, праву і іншых галінах навукі. Значэнне вучэбнай і пазакласнай работы па грамадазнаўству для развіцця сацыяльных, камунікатыўных і даследчыцкіх кампетэнцый вучняў.

## Тэма 5. Метады і прыёмы навучання грамадазнаўству

**5.1. Агульная характарыстыка метадаў навучання.** Метад як педагагічная катэгорыя. Класіфікацыя метадаў навучання. Крытэрыі аптымальнага выбару метадаў навучання. Паняцце аб метадах і прыемах навучання грамадазнаўству. Прыемы вучэбнай работы, паслядоўнасць авалодання вучнямі іх зместам. Сучасныя метады і тэхналогіі арганізацыі профільнага навучання грамадазнаўству.

**5.2. Славесны метад навучання.** Месца і роля вуснага слова ў навучанні грамадазнаўству. Патрабаванні да вуснага выкладання зместу прадмета настаўнікам. Функцыі вуснага слова настаўніка. Асноўныя прыемы вуснага выкладання, іх характарыстыка і метадычныя патрабаванні да іх выкарыстання на ўроку грамадазнаўства.

**5.3. Методыка фарміравання паняццяў і светапоглядных ідэй у працэсе вывучэння грамадазнаўства.** Тэарэтычны характар зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”. Метадалагічныя і метадычныя асновы раскрыцця асноўных паняццяў і ідэй. Класіфікацыя паняццяў па ўзроўню абагуленасці, зместу і ступені іх вядомасці для вучняў. Працэс фарміравання паняццяў, яго асноўныя этапы. Лагічныя шляхі і метадычныя прыемы раскрыцця зместу паняццяў.

**5.4. Рэалізацыя міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязяў пры вывучэнні грамадазнаўства.** Задачы і функцыі іх ажыццяўлення. Метадалагічныя і метадычныя асновы ажыццяўлення міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязяў. Класіфікацыя міжпрадметных сувязяў, асноўныя напрамкі іх устанаўлення. Арганізацыйныя шляхі, метадычныя прыёмы і дыдактычныя сродкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей. Методыка ўстанаўлення ўнутрыпрадметных сувязяў. Роля міжпрадметных сувязяў ў фарміраванні асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

**5.5. Візуальныя сродкі ў навучанні грамадазнаўству.** Роля нагляднасці ў павышэнні якасці засваення грамадазнаўчага матэрыялу. Функцыі і прызначэнне нагляднасці на ўроку. Класіфікацыя наглядных дапаможнікаў. Асноўныя метадычныя прыемы работы з выяўленчай нагляднасцю. Патэнцыял умоўна-графічнай нагляднасці для раскрыцця тэарэтычнага зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”. Асаблівасці методыкі работы з умоўна-графічнай нагляднасцю, яе традыцыйныя і інавацыйныя віды. Выкарыстанне сродкаў экраннай нагляднасці і метадычныя патрабаванні да іх зместу.

**5.6. Практычныя метады навучання грамадазнаўству.** Агульная характарыстыка практычных метадаў навучання. Методыка арганізацыі лабараторных заняткаў па матэрыялу вучэбнага дапаможніка. Тыпалогія

вучэбна-пазнавальных заданняў. Правядзенне практычных заняткаў (урокаў-практыкумаў) па развіцці пазнавальных уменняў, па рашэнні пазнавальных задач, па праверцы вынікаў творча-пошукавай дзейнасці, іх асаблівасці. Самастойная праца вучня як сродак фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый.

**5.7. Дакументальна-метадычныя комплексы ў вывучэнні грамадазнаўства**. Дакументальны матэрыял як важная крыніца ведаў пра сучаснае грамадства. Віды дакументаў і функцыі іх выкарыстання ў навучальным працэсе. Крытэрыі адбору дакументальнага матэрыялу і педагагічная апрацоўка зместу дакумента. Метадычныя прыемы вывучэння дакументальнага матэрыялу. Шматузроўневы аналіз зместу дакумента з улікам яго відавой прыналежнасці. Стварэнне дакументальна-метадычных комплексаў і іх практычнае выкарыстанне на ўроках грамадазнаўства.

**5.8. Праблемнае навучанне ў працэсе выкладання прадмета “Грамадазнаўства”.** Шматпраблемны характар зместу грамадазнаўчых дысцыплін. Характарыстыка прадуктыўных метадаў навучання. Метады і структура праблемнага навучання. Этапы дзейнасці настаўніка і вучняў у яго ходзе. Класіфікацыя вучэбных праблем па змесце і іх характары. Метадычныя ўмовы пастаноўкі і рашэння вучэбных праблем на розных этапах урока. Роля праблемнага навучання ў фарміраванні асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў.

**5.9. Фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый вучняў пры вывучэнні грамадазнаўства.** Змест паняццяў “кампетэнцыя”, “кампетэнтнасць”, “спосаб вучэбна-пазнавальнай дзейнасці”. Спецыфіка работы па фарміраванні асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый у вучняў 9–11 класаў з улікам анталагічнага, псіхалагічнага і прафілактычнага аспектаў.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(дзенная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная работа студэнтаў | Матэрыяльнае забеспячэнне занткаў (нагляндыя, метадычныя г.д.) | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін** | **30** | **28** | **-** | **-** | **50** | | | |
| **1.** | **Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін** | **4** | - | - | - | **4** | | [1] | |
| 1.1 | **Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін як педагагічная навука.**<br>1. Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.<br>2. Працэс навучання грамадазнаўству, яго асноўныя кампаненты.<br>3. Сувязь методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін з іншымі навукамі.<br>4. Асноўныя метадычныя праблемы і асаблівасці методыкі выкладання грамадазнаўчых вучэбных | 2 | | | | 2 | Схема “Сувязь методыкі выкладання грамадазнаў-чых дысцыплін з іншымі навукамі” | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | дысцыплін. | | | | | | | | |
| 1.2 | **Этапы станаўлення грамадазнаўчай адукацыі ў сярэдняй школе.**<br>1. Грамадазнаўчыя дысцыпліны ў сярэдніх навучальных установах Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. – 1917 г.<br>2. Вывучэнне сацыяльна-палітычных дысцыплін у савецкай школе.<br>3. Станаўленне і развіцце грамадазнаўчай адукацыі ў агульнаадукацыйнай школе Рэспублікі Беларусь у 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.<br>4. Сучасныя праблемы і тэндэнцыі развіцця школьнай грамадазнаўчай адукацыі. | 2 | | | | 2 | Вучэбныя праграмы па прадмету “Грамадазнаўства” | [1] | |
| **2.** | **Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”** | **2** | **4** | **-** | **-** | **4** | | [1; 3; 5; 6] | |
| 2.1 | **Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Структура грамадазнаўчай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь.<br>2. Мэты і задачы вывучэння прадмета ў 9–11 класах.<br>3. Неабходнасць вывучэння грамадазнаўчага курса. Яго месца ў сістэме іншых | 2 | | | | | Вучэбныя праграмы па прадмету “Грамадазнаўства”, схема “Структура грамадазнаўчай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь” | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вучэбных прадметаў.<br>4. Базавы і павышаны ўзроўні вывучэння прадмета. | | | | | | | | |
| 2.2 | **Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК) па прадмету “Грамадазнаўства”.**<br>1. Вучэбная праграма па грамадазнаўству, яе структура, асноўныя кампаненты і логіка пабудовы.<br>2. Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб выкладанні вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”, іх прызначэнне і асноўны змест.<br>3. Вучэбныя дапаможнікі для 9–11 класаў, структура і логіка іх пабудовы.<br>4. Склад ВМК па грамадазнаўству і характарыстыка яго асобных элементаў. | | 2 | | | 2 | Вучэбныя праграмы па прадмету “Грамадазнаўства”, інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі, вучэбныя дапаможнікі для 9–11 класаў | [1; 3; 5; 6] | Выкананне практычных заданняў |
| 2.3 | **Улік і ацэнка ведаў вучняў па грамадазнаўству.**<br>1. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў агульнаадукацыйных устаноў па вучэбных прадметах.<br>2. Дзесяцібальная сістэма ацэньвання і яе функцыі.<br>3. Узроўні засваення | | 2 | | | 2 | Табліца “Дзесяцібаль-ная сістэма ацэнкі вынікаў вучэб-най дзейнасці вучняў” | [1] | Выкананне практычных заданняў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вучэбнага матэрыялу і іх характарыстыка.<br>4. Віды і формы кантролю.<br>5. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце “Грамадазнаўства”.<br>6. Экзамен па грамадазнаўству за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. | | | | | | | | |
| **3.** | **Урок грамадазнаўства ў сучаснай школе** | **6** | **6** | **-** | **-** | **9** | | [1; 4] | |
| 3.1 | **Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаўства ў сярэдняй школе.**<br>1. Урок як цэласная сістэма. Перавагі і недахопы класна-ўрочнай сістэмы навучання.<br>2. Псіхалагічныя, дыдактычныя і метадычныя асновы сучаснага ўрока.<br>3. Дыдактычныя, псіхалагічныя, санітарна-гігіенічныя і метадычныя патрабаванні да эфектыўнага ўрока грамадазнаўства. | 2 | | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаў-ства” | [1] | |
| 3.2 | **Формы заняткаў па грамадазнаўчых дысцыплінах ў сярэдняй школе.**<br>1. Урок — асноўная форма вучэбна-выхаваўчай работы.<br>2. Тыпалогія ўрокаў па | 2 | | | | | Камп’ютарная прэзентацыя “Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаў- | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | асноўнай дыдактычнай мэце.<br>3.Структура ўрокаў розных тыпаў.<br>4. Суадносіны тэарэтычнага матэрыялу і практычных заданняў на ўроках па грамадазнаўчых дысцыплінах. | | | | | | ства” | | |
| 3.2.1 | 1. Формы заняткаў па грамадазнаўству: лекцыі, семінары, канферэнцыі, дыскусіі, дыспуты, практыкумы і інш.<br>2. Методыка іх арганізацыі і правядзення.<br>3. Крытэрыі выбару метадаў, сродкаў, тыпаў урока і форм арганізацыі заняткаў па прадмету “Грамадазнаўства”. | | 2 | | | 3 | Камп’ютарная прэзентацыя “Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаў-ства” | [1] | Выкананне практычных заданняў |
| 3.3 | **Падрыхтоўка настаўніка да выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.**<br>1. Складанне каляндарна-тэматычнага і паўрочнага планавання.<br>2. Вызначэнне мэты і задач урока і канструяванне яго зместу.<br>3. Структурна-функцыянальны аналіз зместу грамадазнаўчага матэрыялу.<br>4. Асаблівасці работы настаўніка ў профільным класе. | 2 | | | | | Камп’ютарная прэзентацыя “Прафесійная культура педагога” | [1; 4] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3.1 | 1. Вывучэнне нарматыўных дакументаў па прадмету.<br>2. Навучальныя, развіваючыя і выхаваўчыя задачы ўрока, тэхналогія іх вызначэння і пастаноўкі.<br>3. Метадычнае абгрунтаванне пастаўленых мэт урока, выбраных метадаў, прыёмаў і сродкаў іх рэалізацыі.<br>4. Методыка аналізу і самааналізу ўрока. | | 2 | | | 2 | Метадычныя рэкамендацыі па аналізу і самааналізу ўрока | [1; 4] | Абарона выкананых індывідуаль-ных заданняў |
| 3.3.2 | Наведванне і аналіз урока грамадазнаўства ў сярэдняй школе | | 2 | | | 2 | Метадычныя рэкамендацыі па аналізу і самааналізу ўрока | [1] | Кантроль па рэйтынгавай сістэме (выкананне практычных заданняў) |
| **4.** | **Структура і змест вучэбнага прадмета "Грамадазнаўства"** | **2** | **16** | **-** | **-** | **15** | | [1; 3–6] | |
| 4.1 | **Метадычныя прынцыпы адбору і канструявання зместу вучэбнага прадмета "Грамадазнаўства".**<br>1. Парадак вывучэння раздзелаў прадмета.<br>2. Практычная накіраванасць грамадазнаўчай адукацыі.<br>3. Крыніцы канструявання зместу вучэбнага прадмета "Грамадазнаўства".<br>4. Прынцыпы адбору і асаблівасці пабудовы зместу | 2 | | | | 2 | Схема "Структура грамадазнаў-чай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь" | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вучэбнага прадмета.<br>5. Варыятыўны кампанент зместу школьнай грамадазнаўчай адукацыі. | | | | | | | | |
| 4.2 | **Змест і методыка выкладання раздзела “Чалавек. Грамадства. Культура” (9 клас).**<br>1. Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела.<br>2. Чалавек.<br>3. Дзейнасць, зносіны, узаемадзеянне.<br>4. Асоба, грамадства, дзяржава.<br>5. Чалавек, грамадства, культура.<br>6. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. | | 4 | | | 3 | Вучэбны дапаможнік для 9 класа | [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 4.3 | **Змест і методыка выкладання раздзела “Сучаснае грамадства” (10 клас).**<br>1. Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела.<br>2. Сацыяльная сфера грамадства.<br>3. Эканамічнае жыцце | | 4 | | | 3 | Вучэбны дапаможнік для 10 класа | [4; 5] | Кантроль па рэйтынгавай сістэме (выкананне практычных заданняў) |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | грамадства.<br>4. Палітыка-прававая сфера жыцця грамадства.<br>5. Духоўнае жыцце грамадства.<br>6. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. | | | | | | | | |
| 4.4 | **Змест і методыка выкладання раздзела “Беларуская дзяржава” (11 клас).**<br>1. Структурна-функцыянальны аналіз зместу вучэбнага матэрыялу. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі раздзела.<br>2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.<br>3. Асноўныя галіны права.<br>4. Палітыка беларускай дзяржавы.<br>5. Беларусь у сучасным свеце.<br>6. Вызначэнне навучальных, развіваючых і выхаваўчых задач вывучэння тэм раздзела і магчымасцяў фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. | | 4 | | | 3 | Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, вучэбны дапаможнік для 11 класа | [4; 6] | Кантроль па рэйтынгавай сістэме (выкананне практычных заданняў) |
| 4.5 | **Метадычныя асаблівасці вывучэння светапогляднага зместу прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Вывучэнне асноў ідэалогіі | | 2 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Асновы ідэйна-маральнага і | [1] | Абарона выкананых індывідуаль-ных заданняў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | беларускай дзяржавы.<br>2. Арганізацыя работы вучняў з дзяржаўна-прававымі дакументамі.<br>3. Вывучэнне пытанняў права ва ўстановах адукацыі. Фарміраванне прававой культуры вучняў.<br>4. Вывучэнне пытанняў рэлігіязнаўства. | | | | | | грамадзянска-патрыятычнага выхавання вучняў”, Закон “Аб свабодзе сумнення і рэлігійных арганізацыях” | | |
| 4.6 | **Рэалізацыя развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з грамадазнаўчым матэрыялам.<br>2. Шляхі фарміравання гуманістычнага светапогляду вучняў, іх свядомай адказнай жыццёвай пазіцыі ў розных сферах жыцця і дзейнасці, умення жыць у мнагамерных зносінах з іншымі людзьмі і практычна дзейнічаць з усведамленнем агульна-чалавечых каштоўнасцей.<br>3. Значэнне вучэбнай і пазакласнай работы па грамадазнаўству для развіцця сацыяльных, камунікатыўных і даследчыцкіх кампетэнцый вучняў. | | 2 | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Актывізацыя мыслення вучняў як неабходная ўмова ўдасканаленьня выкладання грамадазнаўства” | [1; 4] | Абарона выкананых індывідуальных заданняў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5** | **Метады і прыемы навучання грамадазнаўству** | **16** | **2** | **-** | **-** | **18** | | [1; 2] | |
| 5.1 | **Агульная характарыстыка метадаў навучання.**<br>1. Метад як педагагічная катэгорыя.<br>2. Класіфікацыя метадаў навучання.<br>3. Крытэрыі аптымальнага выбару метадаў навучання.<br>4. Паняцце аб метадах і прыемах навучання грамадазнаўству.<br>5. Прыемы вучэбнай работы, паслядоўнасць авалодання вучнямі іх зместам.<br>6. Сучасныя метады і тэхналогіі арганізацыі профільнага навучання грамадазнаўству. | 2 | | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Характарыс-тыка метадаў навучання” | [1] | |
| 5.2 | **Славесны метад навучання грамадазнаўству.**<br>1. Месца і роля вуснага слова ў навучанні грамадазнаўству.<br>2. Патрабаванні да вуснага выкладання зместу прадмета настаўнікам.<br>3. Функцыі вуснага слова настаўніка.<br>4. Асноўныя прыемы вуснага выкладання, іх характарыстыка і метадычныя патрабаванні да іх выкарыстання на ўроку. | 2 | | | | 2 | Табліца “Характарыс-тыка метадаў навучання” | [1] | |
| 5.3 | **Методыка фарміравання паняццяў і светапоглядных ідэй у працэсе вывучэння** | 2 | | | | 2 | Схемы “Працэс фарміравання | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **грамадазнаўства.**<br>1. Тэарэтычны характар зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.<br>2. Метадалагічныя і метадычныя асновы раскрыцця асноўных паняццяў і ідэй.<br>3. Класіфікацыя паняццяў па ўзроўню абагуленасці, зместу і ступені іх вядомасці.<br>4. Працэс фарміравання паняццяў, яго асноўныя этапы.<br>5. Лагічныя шляхі і метадычныя прыемы раскрыцця зместу паняццяў. | | | | | | паняццяў”, “Этапы фарміравання паняццяў” | | |
| 5.4 | **Рэалізацыя міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязяў пры вывучэнні грамадазнаўства.**<br>1. Задачы і функцыі іх ажыццяўлення.<br>2. Метадалагічныя і метадычныя асновы ажыццяўлення міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязяў.<br>3. Класіфікацыя міжпрадметных сувязяў. Асноўныя напрамкі іх устанаўлення.<br>4. Арганізацыйныя шляхі, метадычныя прыёмы і дыдактычныя сродкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей. | 2 | | | | 2 | Схема “Структура дыдактычных сувязяў у прадметнай сістэме навучання”, табліца “Міжпрадметныя сувязі вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства“ | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Методыка ўстанаўлення ўнутрыпрадметных сувязяў.<br>6. Роля міжпрадметных сувязяў ў фарміраванні асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. | | | | | | | | |
| 5.5 | **Візуальныя сродкі ў навучанні грамадазнаўству.**<br>1. Роля нагляднасці ў павышэнні якасці засваення грамадазнаўчага матэрыялу.<br>2. Функцыі і прызначэнне нагляднасці на ўроку.<br>3. Класіфікацыя наглядных дапаможнікаў.<br>4. Асноўныя метадычныя прыемы работы з выяўленчай нагляднасцю.<br>5. Патэнцыял умоўна-графічнай нагляднасці для раскрыцця тэарэтычнага зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.<br>6. Асаблівасці методыкі работы з умоўна-графічнай нагляднасцю, яе традыцыйныя і інавацыйныя віды.<br>6. Выкарыстанне сродкаў экраннай нагляднасці і метадычныя патрабаванні да іх зместу. | 2 | | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Візуальныя сродкі навучання” | [1; 2] | |
| 5.6 | **Практычныя метады навучання грамадазнаўству.**<br>1. Агульная характарыстыка | 2 | | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя “Актывізацыя | [1] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | практычных метадаў навучання.<br>2. Методыка арганізацыі лабараторных заняткаў па матэрыялу вучэбнага дапаможніка.<br>2. Тыпалогія вучэбна-пазнавальных заданняў.<br>3. Правядзенне практычных заняткаў па развіцці пазнавальных уменняў, па рашэнні пазнавальных задач, па праверцы вынікаў творча-пошукавай дзейнасці, іх асаблівасці.<br>4. Самастойная праца вучня як сродак фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый. | | | | | | мысленне вучняў як неабходная ўмова ўдасканален-ня выкладання грамадазнаў-ства” | | |
| 5.7 | **Дакументальна-метадычныя комплексы ў вывучэнні грамадазнаўства**.<br>1. Дакументальны матэрыял як важная крыніца ведаў пра сучаснае грамадства.<br>2. Віды дакументаў і функцыі іх выкарыстання ў навучальным працэсе.<br>3. Крытэрыі адбору дакументальнага матэрыялу і педагагічная апрацоўка зместу дакумента.<br>4. Метадычныя прыемы вывучэння дакументальнага матэрыялу. | 2 | | | | 2 | Камп’ютарная прэзентацыя. “Дакументаль на-метадычныя комплексы ў вывучэнні грамадазнаў-ства” | [1; 2] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Шматузроўневы аналіз зместу дакумента з улікам яго відавой прыналежнасці.<br>6. Стварэнне дакументальна-метадычных комплексаў і іх практычнае выкарыстанне на ўроках грамадазнаўства. | | | | | | | | |
| 5.8 | **Праблемнае навучанне ў працэсе выкладання прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Шматпраблемны характар зместу грамадазнаўчых дысцыплін.<br>2. Характарыстыка прадуктыўных метадаў навучання.<br>3. Метады і структура праблемнага навучання. Этапы дзейнасці настаўніка і вучняў у яго ходзе.<br>4. Класіфікацыя вучэбных праблем па змесце і іх характары.<br>5. Метадычныя ўмовы пастаноўкі і рашэння вучэбных праблем на розных этапах урока.<br>6. Роля праблемнага навучання ў фарміраванні асобасных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. | 2 | | | | 2 | Табліца “Этапы дзейнасці настаўніка і вучняў у ходзе праблемнага навучання” | [1] | |
| 5.9 | **Фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый** | | 2 | | | 2 | Вучэбная праграма па грамадазнаў- | [1] | Абарона выкананых індывідуаль- |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **вучняў пры вывучэнні грамадазнаўства.**<br>1. Змест паняццяў “кампетэнцыя”, “кампетэнтнасць”, “спосаб вучэбна-пазнавальнай дзейнасці”.<br>2. Спецыфіка работы па фарміраванні асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый у вучняў 9–11 класаў з улікам анталагічнага, псіхалагічнага і прафілактычнага аспектаў. | | | | | | ству | | ных заданняў |
| | **Усяго:** | **28** | **28** | | **2** | **50** | | | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы, занятка | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і г.д.) | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін** | **6** | **6** | **-** | **-** | | | |
| **1.** | **Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін** | **2** | - | - | - | | [1] | |
| 1.1 | **Методыка выкладання грамадазнаўчых дысцыплін як педагагічная навука.**<br>1. Прадмет і задачы методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.<br>2. Працэс навучання грамадазнаўству, яго асноўныя кампаненты.<br>3. Асноўныя метадычныя праблемы і асаблівасці методыкі выкладання грамадазнаўчых вучэбных дысцыплін.<br>4. Сучасныя праблемы і тэндэнцыі развіцця школьнай | 2 | | | | Схема “Сувязь методыкі выкладання грамадазнаўчых дысцыплін з іншымі навукамі” | [1] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | грамадазнаўчай адукацыі. | | | | | | | |
| **2.** | **Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”** | **-** | **2** | **-** | **-** | | [1; 3] | |
| 2.1 | **Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Вучэбная праграма па грамадазнаўству, яе структура, асноўныя кампаненты і логіка пабудовы.<br>2. Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб выкладанні вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”, іх прызначэнне і асноўны змест.<br>3. Вучэбныя дапаможнікі для 9–11 класаў, структура і логіка іх пабудовы.<br>4. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце “Грамадазнаўства”. | | 2 | | | Вучэбная праграма па прадмету “Грамадазнаўства”, схема “Структура грамадазнаўчай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь”, табліца “Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў” | [1; 3] | Выкананне практычных заданняў |
| **3.** | **Урок грамадазнаўства ў сучаснай школе** | **4** | **2** | **-** | **-** | | [1; 4] | |
| 3.1 | **Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаўства ў сярэдняй школе.**<br>1. Урок як цэласная сістэма. Тыпалогія ўрокаў па асноўнай дыдактычнай мэце. | 2 | | | | Камп’ютарная прэзентацыя “Сучасныя патрабаванні да ўрока грамадазнаўства” | [1] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Дыдактычныя, псіхалагічныя, санітарна-гігіенічныя і метадычныя патрабаванні да эфектыўнага ўрока.<br>3. Формы заняткаў па грамадазнаўству: лекцыі, семінары, канферэнцыі, дыскусіі, дыспуты, практыкумы і інш. Методыка іх арганізацыі і правядзення.<br>4. Крытэрыі выбару метадаў, сродкаў, тыпаў урока і форм арганізацыі заняткаў па прадмету “Грамадазнаўства”. | | | | | | | |
| 3.2 | **Падрыхтоўка настаўніка да выкладання грамадазнаўчых дысцыплін.**<br>1. Складанне каляндарна-тэматычнага і паўрочнага планавання.<br>2. Вызначэнне мэты і задач урока і канструяванне яго зместу.<br>3. Структурна-функцыянальны аналіз зместу грамадазнаўчага матэрыялу. | 2 | | | | Камп’ютарная прэзентацыя “Прафесійная культура педагога” | [1] | |
| 3.2.1 | 1. Вывучэнне нарматыўных дакументаў па прадмету.<br>2. Навучальныя, развіваючыя і выхаваўчыя задачы ўрока, тэхналогія іх вызначэння і пастаноўкі.<br>3. Метадычнае абгрунтаванне пастаўленых мэт урока, | | 2 | | | Метадычныя рэкамендацыі па аналізу і самааналізу ўрока | [1; 4] | Абарона выкананых індывідуаль-ных заданняў |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | выбраных метадаў, прыёмаў і сродкаў іх рэалізацыі.<br>4. Методыка аналізу і самааналізу ўрока. | | | | | | | |
| **4.** | **Структура і змест вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”** | - | **2** | - | - | | [1; 3; 5; 6] | |
| 4.1 | **Метадычныя прынцыпы адбору і канструявання зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.**<br>1. Крыніцы канструявання зместу вучэбнага прадмета “Грамадазнаўства”.<br>2. Прынцыпы адбору і асаблівасці пабудовы зместу вучэбнага прадмета.<br>3. Метадычныя асаблівасці вывучэння светапогляднага зместу прадмета “Грамадазнаўства” (асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы; пытанняў права; пытанняў рэлігіязнаўства). | | 2 | | | Схема “Структура грамадазнаўчай адукацыі ў школах Рэспублікі Беларусь” Камп’ютарная прэзентацыя “Асновы ідэйна-маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання вучняў”, вучэбныя дапаможнікі для 9–11 класаў | [1; 3; 5; 6] | Выкананне практычных заданняў |
| | **Усяго:** | **6** | **6** | **-** | **-** | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

Асноўная:

1. Корзюк, А. А. Методика преподавания обществоведческих дисциплин : учеб.-мет. пособие / А. А. Корзюк. – Минск : БГПУ, 2018. – 244 с.

2. Корзюк, А. А. Выкарыстанне гістарычных крыніц на ўроках гісторыі і грамадазнаўства : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А.А. Корзюк. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2016. – 168 с.

3. Обществоведение : учеб. пособие для 9 кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / А. Н. Данилов [и др.] ; под ред. А. Н. Данилова. – Минск : «Адукацыя і выхаванне», 2019. – 224 с.

Дадатковая:

4. Обществоведение : стратегии успешного урока : практическое пособие; сост. : А.В. Касович, А.А. Корзюк (науч. ред.), Т.О. Сталович. – Минск : БГПУ, 2018. – 108 с.

5. Гирина, В. Н. Обществоведение в 10 классе : учеб.-метод. пособие для учителей общеобразоват. учреждений с бел. и рус. яз. обучения / В. Н. Гирина, Е. И. Снопкова, Е. И. Шалашкевич. – Минск : Нар. асвета, 2012. – 174 с.

6. Гинчук, В. В. Обществоведение в 11 классе : учеб.-метод. пособие для учителей общеобразоват. учреждений с бел. и рус. яз. обучения / В. В. Гинчук – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 176 с.

## Пералік выкарыстоўваемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма:

- даклады на семінарах.

2. Пісьмовая форма:

- тэсты;
- здача экзамена па вучэбнай дысцыпліне.

3. Вусна-пісьмовая форма:

- справаздачы па аўдыторных індывідуальных заданнях з іх вуснай абаронай;
- справаздачы па выкананых у рамках самастойнай работы індывідуальных заданнях з іх вуснай абаронай;
- выкананне практычных заданняў на аўдыторных занятках;
- абарона курсавой работы.

## Патрабаванні да курсавой работы

Структура курсавой работы павінна спрыяць раскрыццю выбранай тэмы і яе састаўных элементаў. Усе часткі курсавой работы павінны быць узаемазвязаны і выкладзены ў строгай лагічнай паслядоўнасці.

Структурнымі элементамі курсавой работы з'яўляюцца: тытульны ліст; змест; уводзіны; асноўная частка; заключэнне; спіс выкарыстанай літаратуры; дадаткі.

Змест ўключае ў сябе назвы глаў і раздзелаў з указаннем нумароў старонак, на якіх пачынаюцца матэрыялы адпаведных частак курсавой работы.

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца выбар тэмы, актуальнасць і ступень яе распрацаванасці, фармулююцца мэта і задачы даследавання, вызначаецца яго аб'ект і прадмет, паказваюцца метады, з дапамогай якіх будуць вырашацца пастаўленыя задачы. Таксама ва ўводзінах даецца агульная характарыстыка работы і паказваецца яе аб'ём: колькасць глаў, дакладная колькасць табліц, схем, малюнкаў, дадаткаў і выкарыстаных крыніц.

Мэта курсавой работы – пэўны вынік (тэарэтычны, практычны), які павінен быць дасягнуты ў ходзе даследавання. Задачы курсавой работы – гэта праграма, накіраваная на дасягненне мэты.

У асноўнай частцы курсавой работы (главах і раздзелах) неабходна лагічна і аргументавана паказаць методыку і вынікі даследавання. Змест структурных частак работы павінен адпавядаць мэце і задачам даследавання.

Заключэнне – гэта лагічнае стройнае выкладанне асноўных вынікаў даследавання і зробленых на іх падставе высноў. У ім павінны быць падведзены вынікі даследавання па праблеме, яно можа ўтрымліваць 3–5 буйных абагульненняў, якія падводзяць вынікі выкананай працы.

Спіс выкарыстанай літаратуры – гэта пералік літаратурных крыніц і іншых матэрыялаў, на якія ў курсавой рабоце прыводзяцца спасылкі. Спіс выкарыстанай літаратуры афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі «Інструкцыі па афармленні дысертацыі, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі».

Дадаткі (пры неабходнасці) уключаюць графічныя, статыстычныя і іншыя матэрыялы па выніках даследавання, а таксама дадатковыя і дапаможныя матэрыялы.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Методыка выкладання гісторыі | Усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі | У тэму "Падрыхтоўка настаўніка да выкладання грамадазнаўчых дысцыплін" дадаць пункт "Методыка аналізу і самааналізу ўрока грамадазнаўства" | Узгоднена, пратакол № 11 ад 30.01.2020 г. |